Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома
Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№37 (382) | Чацвер, 19 лістапада 1959 года. | Цана 10 кап.

# Па універсітэту

## КАБ НАРОДЫ ЖЫЛІ Ў ДРУЖБЕ

Грамадскасць універсітэта горача адабрае вынікі паездкі М. Хрушчова ў ЗША. На факультэтах і ў групах адбыліся сходы, прысвечаныя гэтай падзеі.

— З вялікім хваляваннем сачылі мы за выступленнямі Мікіты Сяргеевіча перад амерыканскім народам і за яго сустрэчамі з дзяржаўнымі дзеячамі ЗША,—сказаў на сходзе студэнтаў і выкладчыкаў геаграфічнага факультэта тав. Н. Я. Рагозін.—У яго прамовах выказваліся нашы пачуцці і помыслы аб тым, каб народы усёй зямлі заўсёды жылі ў міры і дружбе, каб ніколі не было вайны.

На трыбуну падымаюцца ўсё новыя і новыя прамоўцы. Вось выступае студэнтка 4-га курса Людміла Паўловіч. Яна заявіла:

— Мы, студэнты, горача адабраем канкрэтныя прапановы па ўсеагульнаму раззбраенню і забароне выпрабаванняў ядзернай зброі, якія выклаў Мікіта Сяргеевіч на пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН. Мы добра ведаем, что такое вайна. У час апошніх двух войнаў наша Беларусь была полем кровапралітных баёў, у выніку якіх загінулі тысячы людзей. І мы не хочам, каб гэта паўтарылася зноў.

Ажыўлена праходзілі сходы на матэматычным, хімічным, філалагічным і іншых факультэтах. У адзінадушна прынятых рэзалюцыях удзельнікі сходаў горача адабралі вынікі візіта М. С. Хрушчова ў Амерыку.

### КОРАТКА

☆ Адбылося ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета філалагічнага факультэта, прысвечанае 60-годдзю з дня нараджэння загадчыка гісторыі і практыкі партыйна-савецкага друку, кандыдата гістарычных навук, дацэнта Марка Саламонавіча Зярніцкага.

☆ У корпусе гуманітарных факультэтаў адкрылася выстаўка «Кнігі выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна».

☆ Цяпер на факультэтах праводзіцца падпіска на газеты і часопісы. Асабліва дружна падпісаліся на перыядычныя выданні студэнты 1-га курса філфака, IV-га курса беларускага аддзялення, гістарычнага факультэта і інш.

☆ На хімічным факультэце дацэнт А. С. Баркан прачытаў адкрытую лекцыю на тэму «Электралітычная дысацыяцыя». На ёй прысутнічалі, арамя студэнтаў, навуковыя супрацоўнікі і аспіранты факультэта.

## Літаратурны вечар, прысвечаны Ф. Шылеру

Клуб Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна перапоўнены. Тут Беларускае таварыства культурнай сувязі з замежнымі краінамі сумесна са студэнтамі універсітэта арганізавалі ўрачысты вечар, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння вялікага нямецкага пісьменніка Фрыдрыха Шылера.

З уступным словам выступіў акадэмік АН БССР паэт Пятрусь Глебка. З цікавасцю праслухалі прысутныя даклад «Паэзія і драматургія Ф. Шылера», які зрабіў кандыдат філалагічных навук Д. Я. Фактаровіч. Паэт-перакладчык Ю. Гаўрук прачытаў новыя пераклады твораў класіка нямецкай літаратуры на беларускую мову. А вось са сцэны загучэла нямецкая мова. Гэта студэнты універсітэта ў арыгінале выконваюць лірычныя вершы і ўрыўкі з драматычных твораў Ф. Шылера.

У другой частцы канцэрта выступілі беларускія артысты і студэнты тэатральна-мастацкага інстытута. Яны сваю праграму таксама пабудавалі на творах з багатай спадчыны Фрыдрыха Шылера.

**В. ДЫМОЎСКІ.**

## Цікавая экскурсія

З вялікім уздымам вывучаюць першакурснікі гісторыю КПСС. На семінарскіх занятках кожнае пытанне абмяркоўваецца да таго часу, пакуль, яно не стане зразумелым усім. Каб больш глыбока пазнаёміцца з распаўсюджаннем марксісцка-ленінскіх ідэй у Расіі, студэнты першага курса філалагічнага факультэта арганізавалі культпаход у Дом-музей 1-га з'езду РСДРП.

Першакурснікі з цікавасцю разглядалі экспанаты музея і слухалі расказ экскурсавода аб нараджэнні нашай партыі. Экскурсія прынесла многа карысці студэнтам.

**І. КАПЦІЛОВІЧ,**
студэнт 1-га курса філфака.

## Віншавальныя тэлеграмы

**У сувязі са святкаваннем 42-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі ва універсітэт паступілі віншавальныя тэлеграмы ад студэнтаў і выкладчыкаў Казанскага універсітэта, Таджыкскага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, Маскоўскага універсітэта імя М. В. Ламаносава, Тартускага універсітэта, Горкаўскага універсітэта імя М. І. Лабачэўскага, Ленінградскага ордэна Леніна дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Жданава, Кіеўскага ордэна Леніна дзяржаўнага універсітэта імя Т. Р. Шэўчэнкі і інш.**

# Ліст нямецкага друга

**Напярэдадні святкавання 10-й гадавіны Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі поезд дружбы Берлін—Масква зрабіў прыпынак у сталіцы Беларусі. З уласцівай савецкаму народу гасціннасцю жыхары Мінска сустрэлі сваіх сяброў—прадстаўнікоў нямецкага народа. Гэта былі людзі новай Германіі: наватары, перадавікі вытворчасці, інжынеры, настаўнікі, студэнты.**

**Ніжэй змяшчаецца пісьмо аднаго з іх, студэнта рабоча-сялянскага факультэта, які прыйшоў у сцены навучальнай установы пасля дзесяці год працы на вытворчасці. Спадзяёмся, што студэнты нашага універсітэта адклікнуцца на яго.**

*ДАРАГІЯ СЯБРЫ, ПАВАЖАНАЯ ТАВ. ШНЕЕРСОН!*

*Пасля цудоўнай паездкі па вашай краіне мы зноў на радзіме. Усё бачанае, былі гэта гістарычныя месцы, музеі, ці шырокае будаўніцтва гарадоў і прамысловых прадпрыемстваў,—усё яшчэ стаіць перад маімі вачыма. Мне хацелася б адзначыць вялікую гасціннасць, з якой нас усюды сустракалі, і ў гэтай сувязі аддзякаваць яшчэ раз і Вам.*

*Адразу пасля агляду вашага горада наступныя дні былі прысвечаны азнаямленню з Савецкай сталіцай—Масквой. Час ішоў хутка, доўга затрымлівацца дзе-небудзь не ўдавалася, прыцягвала мноства іншых славутых мясцін. У заключэнне, пасля далёкага шляху ва ўтульным спальным вагоне мы атрымалі магчымасць пабываць у сталіцы Украіны—Кіеве. Гэты горад, разбураны нямецка-фашысцкімі войскамі, цяпер, пасля аднаўлення, асабліва чароўны. У наступных пісьмах я апішу больш падрабязна мае дарожныя ўражанні.*

*Прыехаўшы у Патсдам, я энергічна прыняўся за працу, каб папоўніць прапушчаны ў занятках час. Мая група ці клас, як ў нас гавораць,—гэта падрыхтоўчы курс. Мэтай такога аднагадовага падрыхтоўчага курса пры рабоча-сялянскім факультэце з'яўляецца падрыхтоўка да вышэйшай школы. Мае таварышы па групе амаль усе прыйшлі сюды проста з вытворчасці і вызначылі свой шлях, выбраўшы сваёй будучай прафесіяй хімію і біялогію. Гэта значыць, што пасля заканчэння падрыхтоўчага курса і 4-гадовага навучання ў ВНУ мы будзем працаваць настаўнікамі ў сярэдняй палітэхнічнай школе. Усе мы адгукнуліся на заклік нашага ЦК Свабоднага саюза моладзі: «Рабочыя стануць настаўнікамі».*

*Такім чынам, мы цяпер прыкладаем усе намаганні, каб набыць як мага больш ведаў. У нашай перапісцы, якая выходзіць за межы нашых краін, было б цікава даведацца, як вы вырашаеце пытанне падрыхтоўкі добрых педагогаў. Можа нам удасца завязаць перапіску са студэнтамі біялагічнага і хімічнага факультэтаў. Мы зможам, такім чынам, набываць навыкі ў галіне рускай мовы і пісьма. Многія сябры з маёй групы займаюцца ўжо некалькі год рускай мовай. Я ж закончыў пачатковую школу ў 1947 годзе, калі толькі ўводзілася выкладанне рускай мовы. Пастараюся прыкласці ўсе намаганні, каб нагнаць упушчанае.*

*Сябры з паралельнага класа, але другога, руска-нямецкага факультэта, хацелі б таксама ўступіць у перапіску са студэнтамі філалагічнага факультэта Беларускага універсітэта.*

*Калі Вы будзеце так ласкивы, то паведаміце мне некалькі адрасоў дзяўчат і юнакоў, якія хочуць перапісвацца з намі. У чаканні Вашага адказу шлю Вам наша маладзёжнае прывітанне.*

*ДРУЖБА! ФРОЙНДШАФТ!*

*Гюнтэр ГААЗЭ,*
*студэнт рабоча-сялянскага факультэта.*
*Патсдам, Сталінская алея, 79.*



НА ЗДЫМКУ: студэнткі III-га курса біяфака М. Карнейчык, Н. Жалняровіч, І. Кішко на практыкуме па біяхіміі ў лабараторыі фізіялогіі раслін.
Фота І. ЛЕВАГА

# Выхаванне маладых спецыялістаў— асноўная задача прафсаюзнай арганізацыі

(З агульнауніверсітэцкай прафсаюзнай канфэрэнцыі).

Рабоце прафсаюзнай арганізацыі універсітэта па выкананню Пастановы XI Пленума ВЦСПС «Аб мерах па паляпшэнню выхаваўчай і культурна-асветнай работы прафсаюзаў» была прысвечана агульнауніверсітэцкая прафсаюзная канферэнцыя. З дакладам на гэтую тэму выступіў старшыня універсітэцкай прафсаюзнай арганізацыі тав. **М. М. Васін**.

Ён спыніўся на задачах прафсаюзнай работы нашай арганізацыі ў галіне камуністычнага выхавання студэнтаў. Было праведзена многа цікавых і карысных вечароў адпачынку студэнтаў, сустрэч з перадавікамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, вядомымі людзьмі і ўдзельнікамі рэвалюцыйных падзей, вучонымі, пісьменнікамі, студэнтамі краін народнай дэмакратыі і г. д. Папоўніўся склад калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта, палепшыўся іх рэпертуар. Шырокі ўдзел прынялі калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта ў Рэспубліканскай дэкадзе самадзейнага мастацтва.

Гісторыя нашага універсітэта ведае такія выдатныя факты ўдзелу студэнтаў у грамадска-карыснай рабоце, як аднаўленне пасля вайны вучэбных карпусоў, будаўніцтва інтэрнатаў, праца на цаліне і ў калгасах па ўборцы ўраджаю і г. д. Асабліва добра працавалі студэнты ў гэтым годзе. Многа працы і энергіі ўклалі яны ў будаўніцтва галоўнага корпуса універсітэта і новага інтэрната. Акрамя таго, студэнты нашага універсітэта прынялі актыўны ўдзел у рабоце на калгасных палях.

Добра працаваў штаб па кіраўніцтву работай студэнтаў у перыяд летніх канікул на будаўніцтве галоўнага корпуса і інтэрната, які ўзначальваў Міхаіл Папоў.

Важнае месца ў палітыка-выхаваўчай рабоце займае правядзенне ў групах і на курсах палітінфармацый, дакладаў, гутарак і дыспутаў. Па-дзелавому адносіліся да гэтых мерапрыемстваў на другім і трэцім курсах матэматычнага факультэта, на гістарычным, біялагічным і іншых факультэтах.

Побач з гэтым у пастаноўцы выхаваўчай і культурна-асветнай работы прафсаюзная арганізацыя універсітэта мае сур'ёзныя недахопы. Нярэдкія выпадкі, калі палітінфармацыі на курсах зрываліся або праходзілі суха і нецікава, гутаркі не ўвязваліся з жыццём курсаў. Недастаткова прывівалася студэнтам любоў да музыкі і мастацтва.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі.

Дрэнна арганізавана прыцягненне студэнтаў у калектывы мастацкай самадзейнасці. З фізічнага факультэта, напрыклад, удзельнічаюць ва ўніверсітэцкай самадзейнасці толькі шэсць чалавек. Трэба за лік лепшых факультэцкіх сіл камплектаваць агульныя універсітэцкія калектывы, «разгрузіць», па магчымасці, іх удзельнікаў ад грамадскай работы на факультэце. Аб гэтым гаварыў на канферэнцыі аспірант **Г. Герасіменка**.

Пытанням культурна-масавай работы прысвяціў сваё выступленне студэнт геафака **Баркун**. Ён заклікаў грамадскія арганізацыі універсітэта заахвочваць удзельнікаў самадзейнасці, больш справядліва распаўсюджваць запрашальныя білеты на студэнцкія вечары.

З мінулага года нашы інтэрнаты пераведзены па жаданню студэнтаў і рашэнню студсаветаў і прафкома на самаабслугоўванне. Гэтае мерапрыемства дазволіла вызваліць усіх вахцёраў і частку прыбіральшчыц, даўшы такім чынам эканомію грашовых сродкаў больш 500 тысяч рублёў у год, якія накіраваны на паляпшэнне жыллёва-бытавых умоў студэнтаў, на набыццё абсталявання і інвентару для інтэрнатаў.

Жыллёва-бытавыя пытанні закранулі ў сваіх выступленнях прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы тав. **Зюба**, студэнт філфака **Сілін**, старшыня студсавета інтэрната № 1 тав. **Шарамецьеў**, студэнты **Вішнякоў**, **Павядайла** і інш.

Нягледзячы на значнае паляпшэнне бытавых умоў студэнтаў, яшчэ ёсць некаторыя недахопы. У інтэрнаце па вуліцы Кірава няма графінаў, у іншых інтэрнатах таксама не хапае графінаў, швабраў і ануч для мыцця падлогі, скрынак для смецця. У інтэрнаце па вуліцы Свярдлова няма тэлефона.

З прамовай аб выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў выступіў прарэктар па навуковай рабоце тав. **Г. А. Павецьеў**.

У рабоце канферэнцыі прыняў удзел старшыня рэспубліканскага Савета прафсаюзаў работнікаў асветы вышэйшай школы і навучальных устаноў **С. П. Ляснічы**.

**В. КАПЦІЛОВІЧ.**

# ПАРТЫЙНУЮ РАБОТУ НА ЎЗРОВЕНЬ ЗАДАЧ СЯМІГОДКІ!

12 лістапада адбыўся справаздачна-выбарчы сход універсітэцкай партыйнай арганізацыі. Са справаздачным дакладам выступіў сакратар парткома С. Я. Янчанка. Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Ніжэй мы друкуем у скарочаным выглядзе некаторыя выступленні ўдзельнікаў сходу.

## УНІВЕРСІТЭТ ПАВІНЕН СТАЦЬ ЦЭНТРАМ НАВУКОВАЙ ДУМКІ

*З выступлення міністра вышэйшай адукацыі БССР М. В. ДАРАШЭВІЧА*

У сувязі з Законам аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці народнай адукацыі вялікія і адказныя задачы стаяць перад Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Перш за ўсё, неабходна дамагацца таго, каб выпускнік універсітэта меў больш сур'ёзную навуковую падрыхтоўку, больш трывалыя веды і шырэйшы кругагляд.

Многія выпускнікі універсітэта яшчэ слаба бываюць падрыхтаванымі да работы ў школе. Асобы, закончыўшыя фізічны або матэматычны факультэты, напрыклад, часта сустракаюць цяжкасці ў рашэнні задач па курсу сярэдняй школы, выпускнікі філалагічнага факультэта часта не маюць патрэбнай падрыхтоўкі па тэхніцы і культуры мовы, выпускнікі геаграфічнага факультэта не зусім добра ведаюць карту.

Адной з прычын, якія зніжаюць пакуль што якасць падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце, з'яўляецца слабасць матэрыяльна-тэхнічнай базы, недахоп вучэбных памяшканняў, цесната і г. д.

Гэтыя недахопы з цягам часу будуць пераадольвацца. Завяршэнне будаўніцтва галоўнага корпуса дазволіць стварыць ва універсітэце спрыяльныя ўмовы для вучэбнай, выхаваўчай і навукова-даследчай работы.

Побач з пытаннямі вучэбнай работы важнае месца ў бліжэйшы час павінны заняць пытанні планавання падрыхтоўкі кадраў ва універсітэце. Відаць, што па тых спецыяльнасцях, на якія ў рэспубліцы няма вялікага попыту, няма і дзяржаўнай мэтазгоднасці рыхтаваць спецыялістаў у Беларусі, а больш мэтазгодна рыхтаваць гэтых спецыялістаў у іншых ВНУ краіны (геалогія, метэаралогія і інш).

Замест распылення сродкаў на падрыхтоўку спецыялістаў па асобных вузкіх праблемах больш мэтазгодна стварыць добрую вучэбна-вытворчую і лабараторную базу па вядучых для Белдзяржуніверсітэта спецыяльнасцях з такім разлікам, каб наш універсітэт быў адным з буйнейшых у краіне цэнтраў падрыхтоўкі, напрыклад, матэматыкаў, фізікаў, біёлагаў і г. д. Зразумела, гэта не азначае, што трэба скарачаць факультэты філалагічны, гістарычны, геаграфічны і інш., хаця патрэбнасць у мовазнаўцах, літаратарах, гісторыках і географах значна меншая, аднак гэтыя факультэты і адпаведныя кафедры павінны быць ва універсітэце цэнтрамі навуковай думкі, цэнтрамі падрыхтоўкі кадраў навуковых работнікаў.

Як цэнтр навуковай думкі і падрыхтоўкі кадраў навуковых работнікаў універсітэт, наогул, павінен адыграць вялікую ролю. У гэтых адносінах у яго няма і не можа быць канкурэнтаў. Ужо цяпер, як вядома, у сценах універсітэта распрацоўваюцца многія сур'ёзныя праблемы. Будаўніцтва новага корпуса, стварэнне праблемных лабараторый па атамнай і малекулярнай спектраскапіі, па вылічальнай матэматыцы, па хіміі палімераў, а таксама абсталяванне лабараторый навейшымі прыладамі дазволіць значна павысіць узровень навукова-даследчай работы, паставіць новыя навуковыя праблемы.

Універсітэт павінен таксама аказваць пастаянную дапамогу другім ВНУ рэспублікі ў арганізацыі навукова-даследчай работы, у павышэнні кваліфікацыі выкладчыкаў перыферыйных ВНУ. Універсітэт павінен таксама стаць ініцыятарам па правядзенню міжвузаўскіх нарад па розных пытаннях развіцця навукі ў нашай рэспубліцы.

Міністэрства вышэйшай сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР будзе імкнуцца да таго, каб зрабіць універсітэт буйнейшай ВНУ рэспублікі, цэнтрам падрыхтоўкі кадраў для народнай гаспадаркі і культуры нашай рэспублікі.

## Больш увагі грамадскім навукам

*З выступлення кандыдата навук В. М. АЛЯКСЕЕВА*

У справе паляпшэння ідэйна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў найважнейшая роля належыць грамадскім навукам.

Нажаль, некаторая частка студэнтаў не займаецца глыбокім вывучэннем марксісцка-ленінскай тэорыі. Гэта мае месца сярод часткі студэнтаў гістарычнага, матэматычнага і асабліва фізічнага факультэтаў. З непрыемнымі фактамі сустракаемся і на біялагічным факультэце.

Нельга мірыцца з тым, што значная колькасць студэнтаў па грамадскім навукам не падымаецца вышэй здавальняючай адзнакі, а многія наогул паказваюць дрэнныя веды. На дзяржаўных экзаменах было, у прыватнасці, высветлена, што некаторыя выпускнікі слаба засвоілі матэрыялы XXI з'езду КПСС, дрэнна разбіраюцца ў падзеях сучаснага міжнароднага жыцця.

Надзвычай мала студэнтаў займаецца навуковай работай у галіне грамадскіх навук.

Неабходна разам з паглыбленнем вывучэння прыродазнаўчых навук асаблівую ўвагу ўдзяліць навукам грамадскім, веданне якіх патрэбна і невымерна каштоўна для спецыяліста ў любой галіне.

## Надзённыя задачы

*З выступлення рэктара універсітэта А. Н. СЕЎЧАНКІ*

Наша партыйная арганізацыя абавязана мабілізаваць прафесарска-выкладчыцкі склад на паляпшэнне падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў і правядзенне навуковых даследаванняў.

У адпаведнасці з гістарычнымі рашэннямі XXI з'езду КПСС асаблівая ўвага павінна быць звернута на падрыхтоўку кадраў і правядзенне даследаванняў у галіне фізіка-матэматычных навук. Міністэрствам вышэйшай адукацыі прадугледжана падрыхтоўка ў нашым універсітэце спецыялістаў па новых галінах—вылічальнай матэматыцы, вылічальнай тэхніцы, радыёэлектроніцы, паўправаднікам. Мы павінны таксама рыхтаваць кадры, якія здольны будуць асвоіць новыя тэхналагічныя працэсы на хімічных заводах, што будуюцца ў Беларусі.

На жаль, у справе падрыхтоўкі хімікаў у нас ёсць шэраг недахопаў. Невялікія па колькасці ў нас кадры вучоных хімікаў. Няма каму чытаць курс па сучасных фізічных метадах у хіміі. Вучоны савет фізфака павінен абмеркаваць гэта пытанне і дапамагчы тут хімікам.

У сучасных умовах узрастае значэнне грамадскіх навук. Кафедры грамадскіх навук абавязаны не толькі рыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры, але і ствараць фундаментальныя працы, абагульняючыя законамернасці развіцця і практыку сацыялістычнага будаўніцтва. Яны разам з тым абавязаны настойліва і баявіта выкрываць сучасны рэвізіянізм і буржуазную ідэалогію.

Намі зроблены першыя крокі ў справе набліжэння вышэйшай школы да жыцця. Усе першыя і другія курсы універсітэта працуюць па новых вучэбных планах. Унесены істотныя змены ў вучэбныя планы трэціх і чацвертых курсаў у бок павышэння агульна-тэарэтычнага ўзроўню і паляпшэння падрыхтоўкі выпускаемых універсітэтам спецыялістаў. Мы правялі значную падрыхтоўчую работу па паляпшэнню арганізацыі вытворчай практыкі студэнтаў.

Значную ўвагу надаем мы прывіццю студэнтам працоўных навыкаў. Інтэрнаты і часткова вучэбныя карпусы пераведзены на самаабслугоўванне. Актыўны ўдзел прымаюць студэнты ў будаўніцтве галоўнага вучэбнага корпуса і інтэрната.

Навукова-грамадская работа універсітэта прысвечана рашэнню шэрагу буйных навуковых праблем, непарыўна звязаных з шырокім прымяненнем навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі ў розных галінах народнай гаспадаркі і з практыкай камуністычнага будаўніцтва. У прыватнасці на радыёфізічнай лабараторыі, па кафедры спектральнага аналізу, па паўправаднікам і кафедрам хімічнага і біялагічнага факультэтаў распрацоўваецца шэраг праблем, што маюць важнае народнагаспадарчае значэнне. Рад прац ужо укаранёны ў вытворчасць.

Партыйная арганізацыя універсітэта павінна аказваць больш актыўную дапамогу кафедрам, дэканам факультэтаў і рэктарату па далейшаму ажыццяўленню Закона аб перабудове вышэйшай адукацыі. Неабходна больш часта ставіць на абмеркаванне партыйных арганізацый справаздачы выкладчыкаў, кафедр і дэканаў факультэтаў аб перабудове выкладання па асобным дысцыплінам, правядзенні вучэбнай практыкі, арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, падрыхтоўцы і падбору навукова-педагагічных кадраў.

## Даволі патураць гультаям

*З выступлення сакратара партарганізацыі філфака М. А. ПАЎЛЕНКІ*

Ва універсітэце нярэдкія выпадкі, калі студэнтаў, выключаных з другіх інстытутаў, асабліва з тэатральнага, загадам рэктара або яго намесніка, залічваюць на філалагічны факультэт. Робіцца гэта, як правіла, без ведама і згоды дэканата «у парадку пераводу». Такія людзі прыносяць да нас так званыя «стыль», «хвасты» з васьмідзесяці незданых прадметаў.

Такая ж практыка існуе і з пераводам завочнікаў на стацыянар, прычым не лепшых, а горшых, тых, хто дрэнна займаўся. З завочнага была пераведзена на стацыянар Лазанава, дайшла да 5-га курса, і тут на экзаменах выявілася, што яна блытае беларускага паэта П. Труса з польскім пісьменнікам Б. Прусам. Студэнт Алешка, пераведзены з завочнага факультэта ў бягучым годзе, адмовіўся выехаць разам з усімі ў калгас на ўборку бульбы на той падставе, што ў яго дзесяць нездадзеных прадметаў. Кобля, пераведзены з тэатральнага інстытута, прадставіў спраўку, што працаваў у інстытуце фізікі Акадэміі навук БССР, затым вучыўся на завочным факультэце. З завочнага ён адлічаны, як невыконваючы вучэбны план. Партком, партыйныя арганізацыі павінны дабіцца, каб падобная практыка залічэнняў выключаных і непаспяваючых была асуджана.

Ёсць недахопы ў рабоце адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта і прарэктара т. Зюбы. Па віне адміністрацыйна-гаспадарчай часткі зданы ў эксплуатацыю жыллёвы дом для выкладчыкаў па вуліцы Няміга з вялікімі дэфектамі.

## Патрэбен кантроль за якасцю выкладання

*З выступлення дацэнта У. М. СІКОРСКАГА*

Грамадскія навукі фарміруюць светапогляд моладзі, ім належыць рашаючая роля ў выхаванні студэнцтва. Аднак на працягу справаздачнага перыяду ні факультэцкія Вучоныя саветы, ні грамадскія арганізацыі факультэтаў не абмяркоўвалі на сваіх пасяджэннях якасці выкладання гэтых навук ва універсітэце. Партком, хаця яго членамі і былі кіраўнікі грамадскіх кафедраў, таксама выпусціў гэта пытанне з поля свайго зроку, выпала яно і са справаздачнага даклада.

Мала ўвагі надаецца ў нас вячэрняму аддзяленню. У мінулым годзе былі зрывы заняткаў, не змянілася становішча і ў гэтым. Вечарам, як правіла, у дэканатах няма ні дэкана, ні сакратара. Не працуе гардэроб. Выкладчыкі часам не прыходзяць на лекцыі. Пажадана, каб гэтымі пытаннямі заняліся Вучоны савет, партыйныя арганізацыі факультэтаў, партком.

## Настаў час навесці парадак

*З выступлення загадчыка аддзела кадраў П. А. КРАЎЦОВА*

У сваім выступленні я хачу затрымаць увагу партыйнага сходу на штатах прафесараў і выкладчыкаў і на размеркаванні маладых спецыялістаў. З адным і з другім у нас не ўсё добра.

На сёння ва універсітэце працуюць 32 дактары навук і прафесары. Аднак з іх—20 сумяшчальнікаў. Сумяшчальнікі узначальваюць 14 кафедраў з 47 дзейнічаючых ва універсітэце.

Да таго ж выкладчыкамі ва універсітэце працуюць 127 чалавек без ступеняў і званняў.

Гэта лічба і тое, што ў нас працуе толькі 3,3 працэнта штатных дактароў навук і прафесараў да агульнай колькасці выкладчыкаў, красамоўна гаворыць, што універсітэту востра патрэбны выкладчыцкія кадры.

Гэту праблему мы спрабавалі вырашыць за кошт сумяшчальнікаў і працуючых пагадзінна. Нажаль, карысці ад гэтага мала.

Сумяшчальнікі ўхіляюцца ад чытання лекцыйных курсаў. Так, за 1958—1959 навучальны год т. Эльберт прачытаў усяго 36 лекцыйных гадзін, т. Яругін—56, т. Лупіновіч—60, а Бялькевіч ухітрыўся не прачытаць ніводнай гадзіны.

Пагадзінны фонд у нас складае звыш 800 тысяч рублёў, фактычна выдаткоўваецца больш 900 тысяч. Бяда ў тым, што некаторыя работнікі, якія працуюць пагадзінна, недастаткова кваліфікаваныя, часам не маюць нават вышэйшай адукацыі.

Для таго, каб выправіць такое становішча, мы напісалі ў міністэрства абгрунтаваную заяўку на 35 штатных адзінак. Гэта дазволіць сэканоміць пагадзінны фонд, палепшыць вучэбную і палітыка-выхаваўчую работу сярод студэнтаў.

Ёсць хібы ў размеркаванні маладых спецыялістаў. Так у 1959 годзе ўне плана, зацверджанага міністэрствам і ўзгодненага з Дзяржпланам БССР, было накіравана па заяўках АН БССР, заводаў і іншых арганізацый 112 спецыялістаў. Такая практыка з'яўляецца шкоднай, персанальныя заяўкі не заўсёды бываюць аб'ектыўнымі.

У сувязі з тым, што некаторыя маладыя спецыялісты не выязджаюць на працу па прызначэнню, мне здаецца, было б мэтазгодным выплачваць выпускнікам пад'ёмныя і грашовую дапамогу толькі пасля прыбыцця іх на месца прызначэння.

* * *

У спрэчках выступілі таксама т. т. **А. А. Гусак**—сакратар партыйнай арганізацыі матэматычнага факультэта, **Р. В. Авечкін** — загадчык кафедры фізічнага факультэта, **М. Ф. Ярмоленка**—прафесар хімічнага факультэта, **М. А. Жыдовіч**—прафесар філалагічнага факультэта, **А. М. Міхайлаў**—старшыня мясцкома, **Г. А. Павецьеў**—прарэктар на навуковай рабоце, **С. Р. Драбязка**—сакратар партарганізацыі юрыдычнага факультэта.

Тав. Гусак гаварыў аб тым, што факультэт атрымаў электронна-вылічыльную машыну каштоўнасцю звыш мільёна рублёў. Да гэтага часу машына не ўстаноўлена, таму што адміністрацыйна-гаспадарчая частка не ў сілах знайсці неабходныя для гэтага чатыры тысячы рублёў. Інжынеры, якія займаюцца ўстаноўкай машыны, літаральна кожны дзень прыходзяць да прарэктара т. Зюбы, аднак да гэтага часу безвынікова. Тав. М. А. Жыдовіч прасіла партком і рэктарат хадайнічаць перад міністэрствам аб выдзяленні сродкаў для арганізацыі экспедыцыі па вывучэнню беларускіх дыялекталагічных гавораў. Тав. Міхайлаў спыніўся на пытанні аб вылучэнні лепшых камуністаў у склад кіруючых прафсаюзных органаў, а таксама аб партыйным кіраўніцтве прафсаюзнымі арганізацыямі універсітэта.

У заключэнне сходу была прынята рэзалюцыя, накіраваная на паляпшэнне усёй партыйнай, вучэбна-вытворчай і масава-палітычнай работы ва універсітэце.

### НОВЫ СКЛАД ПАРТКОМА

Сход абраў новы склад партыйнага камітэта. У яго ўвайшлі:

**А. А. ВОЛК**—сакратар.

**В. І. МАРТАВІЦКІ**—намеснік сакратара, адказны за палітыка-масавую работу.

**М. А. ЖЫДОВІЧ**—намеснік сакратара, адказны за аргмасавую работу.

**А. Ф. ПРАТАСЕНЯ**—адказны за навуковую работу.

**А. Н. СЕЎЧАНКА.**

**А. М. МІХАЙЛАЎ.**

**С. П. БЯКЕШКА**—адказны за вучэбна-вытворчую работу.

**У. Д. МУХАЕЎ**—адказны за абаронча-спартыўную работу

**У. М. СІКОРСКІ**—адказны за партасвету.

**В. І. СТАРАВОЙТАЎ**—адказны за культмасавую работу.

**М. Я. ЦІКОЦКІ**—адказны за друк.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 10825. Зак. 1722. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна Тыраж 2000 экз.